**УДК 272:94(476.5) «1975/1986»**

# РЫМА-КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ У ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ НАПРЫКАНЦЫ 1970-х – СЯРЭДЗІНЕ 1980-х гг.: НАПЯРЭДАДНІ КАРДЫНАЛЬНЫХ ЗМЕН

***К.В. ЛАЎРЫНЕНКА***
***(Люблінскі Каталіцкі ўніверсітэт Яна Паўла ІІ)***

*У артыкуле разглядаецца становішча Рыма-каталіцкага Касцёла на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў другой палове 1970-х-першай палове 1980-х гг. – напярэдадні кардынальных змен. Ва ўмовах недахопаў святароў вялікую ролю ў рэлігійным жыцці пачынаюць адыгрываць свецкяі вернікі. Таксама вялікую дапамогу парафіям аказвалі манахіні Кангрэгацыі Сясцер Служак Езуса ў Эўхарыстыі. У гэты перыяд у дзейнасці Касцёла назіраюцца новыя тэндэнцыі, у прыватнасці, выкарыстанне рускай мовы замест польскай у казаннях некаторых святароў.*

***Ключавыя словы:*** *касцёл, ксендз, парафія, упаўнаважаны па справах рэлігій, катэхізацыя.*

**Уводзіны.** З 1988 г. у Савецкім Саюзе распачаліся паступовыя змены ў адносінах да рэлігіі і рэлігійных інстытутаў. Гэта прывяло да адраджэння структур Рыма-каталіцкага Касцёла на Беларусі. Аднак некалькі дзесяцігоддзяў ганенняў і існаванне ў неспрыяльных варунках сур'ёзным чынам адбіліся на стане царкоўнай арганізацыі ў БССР.

Мэта артыкула – разгледзець стан Рыма-каталіцкага Касцёла напрыканцы 1970-х гг. – першай палове 1980-х гг. на тэрыторыі Віцебскай вобласці, напярэдадні адраджэння.

Даследаванне пабудавана на выкарыстанні шырокага кола дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, а таксама навуковых публікацый. Метадалагічную базщу публікацыі склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (гістарычны і лагічны, аналіз і сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны) метады.

**Асноўная частка.** Віцебская вобласць была ўтворана 15 студзеня 1938 г. Напрыканцы 1970-х гг. у яе склад уваходзілі: Віцебскі, Бешанковічскі, Аршанскі, Гарадоцкі, Дубровенскі, Лёзненскі, Сененскі, Лепельскі, Талачынскі, Чашніцкі, Шумілінскі, Полацкі, Верхнядзвінскі, Расонскі, Ушачскі, Браслаўскі, Міёрскі, Глыбоцкі, Докшыцкі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі раёны [1, с. 322]. Паводле касцёльнага падзелу яе заходняя частка ў свой час належала да Віленскай архідыяцэзіі, усходняя – да Магілеўскай. Ва ўсходняй частцы легальнае рэлігійнае жыццё было знішчана яшчэ ў міжваенны перыяд. Апошняя рыма-каталіцкая святыня на гэтай тэрыторыі – касцёл Святога Антонія Падуанскага – быў забраны ў вернікаў у 1938 г., аднак ўжо пасля арышту святара (1937 г.) парафія амаль не функцыянавала. Заходняя частка вобласці ў 1921 – 1939 гг. знаходзілася ў складзе Другой Рэчы Паспалітай, дзе каталіцтва заўмала прывілеяванае становішча.

У другой палове 1970-х гг. на тэррыторыі Віцебскай вобласці было зарэгістравана 11 касцёлаў. Усе яны канцэнтраваліся ў заходняй частцы вобласці: у Браслаўскім раёне – касцёлы у г. Браслаў, в. Слабодка, в. Далёкія, у Глыбоцкім раёне – г. Глыбокае, в. Мосар, в. Задарожжа, у Докшыцкім – в. Ваўкалаты, у Міерскім – г. Міёры і в. Ідолта, у Пастаўскім – у вёсках Кама і Лынтупы [2, л. 97].

Усяго за перыяд 1944 – 1972 гг. на гэтай тэрыторыі з рэгістрацыі было знята 25 касцёлаў. Будынкі касцёлаў былі перададзены райвыканкамам, а прадметы культу – у іншыя касцёлы альбо знішчаны. З гэтых знятых з рэгістрацыі касцёлаў 5 знаходзіліся у аварыйным стане і ніякім чынам не выкарыстоўваліся, 1 быў ададдзены пад спартыўную залу, 14 пад склады, 2 перададзены пад клубы, 3 разабраны на дровы [2, л. 97]. Пры гэтым былыя касцёлы знішчаліся і надалей. Так, у 1984 г. праз нядбаласць згарэў былы драўляны касцёл у в. Мяжаны Браслаўскага раёна, пабудаваны у 1926 – 1928 гг., які у пасляваенны перыяд выкарыстоўваўся пад склад. Быў цудам ураташаны ад знішчэння будынак касцёла ў Дунілавічах, пабудаванага у XVIII ст. У 1984 г. старшыня сельсавету вырашыла яго ўзарваць, аднак у апошні момант сапёр адмовіўся гэта рабіць, каб не пашкодзіць хаты, што знаходзіліся каля касцёла [3, s. 37].

Зразумела, што такі стан рэчаў не задавальняў вернікаў. На працягу ўсяго пасляваеннага перыяду яны рэгулярна пісалі заявы як у адрас упаўнаважанага Савета па справах рэлігій, так і савецкіх і партыйных органаў з просьбамі вярнуць ім касцёлы.

Новая хваля падачы заяваў аб рэгістрацыі касцёлаў распачаўся у 1976 г. Так, вернікі Варапаеўскага і Юнькаўскага сельсаветаў Пастаўскага раёна арганізавалі збор подпісаў у 12 вёсках за вяртанне касцёла у Лучаі, накіраваўшы заяву у ЦК КПСС. У 1977 г. яны падалі заяву паўторна [4, л. 122; 5, л. 39]. Вернікі Дрысвяцкага касцёла сваю заяву аб вяртанні ім касцела накіравалі у апарат упаўнаважанага ў справах рэлігій. Нягледзячы на адмовы вярнуць ім Параф'яўнаўскі касцёл, вернікі працягвалі пісаць у шэраг інстанцый. Ужо ў 1978 г. упаўнаважаны атрымаў 17 заяў ад вернікаў аб рэгістрацыі касцёлаў

у в. Параф'янава, в. Плюсы Браслаўскага раена, в. Удзела Глыбоцкага раёна [6, л. 51]. Вернікі в. Плюсы толькі за год накіравалі ў розныя інстанцыі 7 заяў аб вяртанні ім касцёла.

Стаміўшыся ад бяспынных хаджэнняў па інстанцыях, людзі пераходзілі да больш рашучых дзеянняў. Так, 2 лістапада 1977 г. на могілках каля станцыі Параф'янава вернікі правялі сход, на якім абралі "дваццатку" касцёла. 28 сакавіка 1978 г. а 12 гадзіне каля клуба станцыі Параф'янава сабраліся 13 чалавек, у асноўным пенсійнага ўзросту. Адзін з прысутных стаў патрабаваць у старшыні Параф'янаўскага сельсавета вяртання ім касцёла. Цяжка сказаць, як на самой справе праходзіла гутарка, бо па афіцыйнай версіі, пададзенай упаўнаважаным "старшыня адказала, з якой прычыны касцёл быў зняты з рэгістрацыі, пасля чаго вернікі разыйшліся" [7, л. 46-47].

Да больш радыкальных дзеянняў перайшлі вернікі з в. Опса Браслаўскага раёна. У свой час старшыня Опсаўскага сельсавета і старшыня калгасу заявілі мясцовым вернікам, што пасля пабудовы калгаснага складу касцёл ім болей не будзе патрэбны. У выніку прыбралі тэрыторыю касцёла, затым завезлі будаўнічыя матэрыялы і самастойна пачалі рамонт будынка. Аднак яны паспелі толькі ашкліць вокны, як на гэта адрэагавалі партыйныя і савецкія органы, забараніўшы аднаўленне вернікамі касцёла, што выклікала паток скаргаў і заяваў ад мясцовых жыхароў. Пры гэтым ўлады вырашылі вярнуць 300 рублеў, патрачаных на аднаўленне касцёла, але вернікі адмовіліся іх забраць [8, л. 93]. Падобным чынам паступілі і вернікі у Міерскім раене. У 1981 г. яны вырашылі без дазволу ўладаў пабудаваць капліцу на могілках, паспеўшы нават завезці будаўнічыя матэрыялы. Але мясцовыя ўлады спынілі гэтае будаўніцтва, а ксёндз Баляслаў Заянц, пробашч парафіі Ідолта, быў абвінавачаны у "падбухторванні" і пакараны штрафам [9, л. 14-15].

У 1979 г. некалькі заяў у розныя інстанцыі аб вяртанні касцёла паступілі ад вернікаў в. Германавічы [10, л. 19; 11, л. 24] Такім чынам, толькі за перыяд 1976-1979 гг. вернікі вобласці ставілі пытанне аб перадачы ім 8 касцёлаў.

У 1980 г. у апарат упаўнаважанага у справах рэлігій і райгарвыканкам паступіла 3 заявы аб адкрыцці касцёла ў в. Опса, у 1981 г. паўторную заяву даслалі вернікі Опсы, 1 заява паступіла ад вернікаў Параф'янава, яны ж зноў накіравалі па адной заяве у наступным, 1983 г. [12, л. 39; 13, л. 27; 14, л. 38]. У 1984 г. ўзнялі пытанне аб перадачы ім касцёла вернікі з Друі, канстатуючы, што "касцёл як цудоўны помнік архітэктуры перўтварылі у руіны". Яны ж прасілі дазволу адрамантаваць касцёл за ўласны кошт. Але упаўнаважаны у справах рэлігій пры Віцебскім аблвыканкаме лічыў, што касцёлу трэба знайсці прымяненне ў сацыяльна-культурных мэтах [15, л. 30]. У тым жа годзе вернікамі ставілася пытанне аб перадачы ім касцёла ў Відзах Браслаўскага раёна, у г. Паставы, у в. Лучай Пастаўскага раёна. У 1985 г. зноў былі накіраваны 2 лісты аб адкрыцці касцёла у Паставах і 3 у Параф'янаве [16, л. 37; 17, л. 37].

Зразумела, што ніводны касцёл вернікам перададзены не быў. Кожны раз вернікі атрымоўвалі "адпіскі", што нібыта будынкі ў аварыйным стане, заняты пад склады альбо будуць выкарыстоўвацца ў народнай гаспадарцы. Пры гэтым актыўнасць вернікаў па вяртанні касцёлаў выклікала вялікую незадаволенасць як апарата упаўнаважанага у справах рэлігій, так і прадстаўнікоў савецкіх і партыйных органаў. Асабліва іх хваляваў той факт, што пад заявамі з просьбамі аб вяртанні касцёлаў стаялі сотні подпісаў – 500, 600 [18, л. 6]. Адначасова упаўнаважаны гэтую актыўнасць вернікаў тлумачыў даволі спрошчана, пішучы, што "адной з прычынаў падачы заяваў з'яўляецца тое, што будынкі касцёлаў не выкарыстоўваліся у народнай гаспадарцы, а з некаторых нават не была вывезена культавая маемасць. Гэта дае надзею на тое, што пры зручнай сітуацыі касцёлы зноў будуць адчынены" [4, л. 122]. Улады спрабавалі ўсялякім чынам згасіць гэтую актыўнасць вернікаў. Члены камісій садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах высвятлялі, хто з'яўляўся ініцытарам падачы заяваў, затым праводзілі з імі так званыя "індывідуальныя гутаркі", узмацнялі атеістычную работу. Вернікаў выклікалі ў райвыканкам, нават аказвалі ціск на падпісантаў праз іх дзяцей.

Іншая сітуацыя склалася ва ўсходняй частцы вобласці, дзе легальныя структуры Рыма-каталіцкага Касцёла былі знішчаны яшчэ у даваенны час. Аднак гэта не азначала знішчэння рэлігійнага жыцця ў гэтай частцы вобласці ўвогуле. У пасляваенны час у Верхнядзвінскім, Полацкім, Лепельскім і Шумілінскім раёнах існавалі так званыя "незарэгістраваныя" групы католікаў, якія збіраліся разам на сумесныя малітвы, час ад часу да іх даязджалі з душпастырскай паслугай святары. Асабліва моцнай была група католікаў у Шумілінскім раене. З 1960-х гг., калі святар Юзэф Барадзюля, які раней апекаваўся вернікамі гэтай мясцовасці, па прычыне кепскага стану здароўя, моцна падарванага знаходжаннем у лагерах і ссылках, не мог ужо сюды даяджаць, вялікую апостальскую працу праводзіла Агата Літоўка з в. Мікалаева. У ейнай хаце пастаянна праводзіліся набажэнствы – на Вялікдзень адбывалася начное чуванне, у нядзелю вернікі збіраліся на ружанцовую малітву. Таксама яна ўдзяляла сакрамэнт хросту шматлікім дзецям, якіх патаемна прывозілі з розных куткоў Беларусі бацькі [19].

Дзеля таго, каб мець свае месца малітвы, у 1976 г. вернікі в. Мікалаева збудавалі капліцу на могілках – там яны маліся, збіраючыся ў нядзелю. Аднак уначы капліца была спаленая мясцовымі камсамольцамі. Такі лёс напаткаў і капліцы, пабудаваныя ў 1979-м і 1981-м гг. Пасля другога спалення капліцы, вернікі збіраліся на малітвы пад невялікім навесам, пастаўленым на могілках. Пры гэтым вернікі

імкнуліся легалізаваць свае існаванне – напачатку жніўня 1978 г. яны сабралі звыш 250 подпісаў пад заявай аб адкрыцці касцёла былой ульскай парафіі на базе капліцы на могілках у в. Шодзікі [6, л. 81-82].

У 1978 г. у Віцебску каля 200 католікаў падпісала завяву да ўладаў на дазвол адкрыць капліцу ў прыватнай хаце. 300 другіх католікаў праз боязь рэпрэсій гэтую акцыю падтрымалі толькі маральна [20, s. 286; 21, л. 24.]. Адной з верніц, якая збірала подпісы за адкрыццё капліцы, была Станіслава Семеракова. На гэтую акцыю яе дабраславіў святар з Даугаўпілса (Латвія), куды жанчына выязджала для прыняцця сакрамэнтаў і удзелу у Святой Імшы [22].

Паколькі ніводнага касцёла ва ўсходняй частцы вобласці не існавала, таму вернікі гэтага рэгіёна час ад часу наведвалі касцёлы ў Літве і Латвіі – у Вільнюсе, Краславе, Індры і Даўгаўпілсе.

Увесь пасляваенны час у вобласці адчуваўся сур’езны недахоп святароў, паколькі іх колькасць у вобласці пастаянна зніжалася. Напрыканцы 1970-х гг. на тэрыторыі Віцебскай вобласці душпастырскую службу неслі толькі 7 святароў, якія абслугоўвалі 11 касцёлаў [23, л. 31]. Гэта былі ксяндзы Лцыян Паўлік, 1913 г. н. (Задарожжа), Юзэф Францкевіч, 1912 г. н. (Глыбокае), Ян Грабоўскі, 1912 г. н. (Міёры), Станіслаў Гурскі, 1909 г. н. (Слабодка), Казімір Тамковіч, 1910 г. н. (Ваўкалата), Баляслаў Заянц, 1913 г. н. (Ідолта), Чэслаў Вільчынскі, 1928 г. н. (Браслаў). Усе яны ў свой час прайшлі праз тыя ці іншыя формы рэпрэсій.

Так, ксёндз Казімір Тамковіч быў арыштаваны ў 1948 г. і асуджаны па артыкуле 72 КК БССР на 25 гадоў пазбаўлення волі, 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў і канфіскацыю маёмасці [24, s. 599]. Ксендз Люцыян Паўлік, служачы ў Друі, перад пагрозай арышту ад жніўня 1949 г. быў вымушаны хавацца на хутарах друйскай, а потым ідалтоўскай парафій. Пасля таго, як адзін з укрывальнікаў святара пасля страшнага збіцця яго прадстаўнікамі МГБ не вытрымаў катаванняў, месца схованкі святара было выяўлена. У выніку 18 кастрычніка 1950 г. ксёндз Люцыян Паўлік быў арыштаваны на тэрыторыі парафіі Ідолта. 30 снежня 1950 г. суд вынес яму прысуд: «за варожую прапаганду супраць савецкай улады» па арт. 72 “б” і 76 КК БССР святар быў прыгавораны да смяротнай кары, якая была заменена на 25 гадоў знаходжання у лагеры, 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў і канфіскацыю маемасці. У камеры смяротнікаў святар знаходзіўся да 25 сакавіка 1951 г. [24, s. 467].

Ксёндз Ян Грабоўскі быў арыштаваны 18 кастрычніка 1949 г. Першапачаткова ўтрымліваўся у турме ў г. Глыбокае, потым у г. Полацк, дзе ў 1950 г. быў асуджаны па артыкуле 72 КК БССР на 25 гадоў пазбаўлення волі, 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў і канфіскацыю маемасці [24, s. 239–240; 25, лл. 58, 95–96].

У 1949 г. ксёндз Юзаф Францкевіч быў вымушаны хавацца перад пагрозай арышту НКУС, аднак 15 кастрычніка 1950 г. ён быў арыштаваны ў Іказні і перавезены ў вязніцу ў Полацк. 30 снежня 1950 г. святар быў прыгавораны да смяротнага пакарання “за варожую прапаганду супраць савецкай улады”. Пэўны час ён знаходзіўся ў камеры смяротнікаў у вязніцы ў Оршы, затым смяротнае пакаранне было заменена на 25 гадоў знаходжання ў лагерах і 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў [24, s. 226–227].

Ксёндз Станіслаў Гурскі з 1949 г. знаходзіўся на нелегальным становішчы, пакуль 7 кастрычніка 1952 г. не быў арыштаваны органамі МДБ. Аднак 15 студзеня 1953 г. ён быў вызвалены і праз кароткі час атрымаў дазвол на служэнне ў Валкалаце [26, лл. 11–14, 17–19]. З пачаткам масавых арыштаў святароў ксёндз Заёнц хаваўся ў Браславе, пазней на тэрыторыі парафій Слабодка і Плюсы, пэўны час на літоўскім баку пограннай граніцы на Дзвіне. Знаходзячыся на нелегальным становішчы, святар служыў св. Імшы, а імшальныя стыпендыі аддаваў сёстрам-эўхарысткам і людзям, у якіх ён укрываўся. Святар выйшаў з укрыцця 27 ліпеня 1953 г. і быў арыштаваны, але праз кароткі час выпушчаны. Пасля пэўных цяжкасцяў ксёндз Заянц зноў атрымаў дазвол на служэнне ў Ідолце [24, s. 661].

Цярністым быў як жыццёвы шлях, так і шлях да святарства ўзростава наймалодшага ксяндза ў Віцебскай вобласці на пачатку 1980-хх гг. Чэслава Вільчынскага. Ураджэнец парафіі Плюсы, якая знаходзілася недалека ад Браслава, першы раз ён быў арыштаваны неўзабаве пасля заканчэння вайны – нібыта за ўхіленне ад прызыву у войску. Толькі калі ягоны бацька даказаў, што сын яшчэ не дасягнуў прызыўнага ўзросту, юнак быў вызвалены. Прызваўшыся у войска у 1948 г., у Полацку за згодай афіцэра Чэслаў Вільчынскі выйшаў з цягніка, каб набыць ежы. Тым часма цягнік адышоў. Нягледзячы на тое, што юнак адразу ж паведаміў аб здарэнні, праз некаторы час у паказальным працэсе у Докшыцах ён быў асуджаны на 10 гадоў пазабаўлення волі. Пасля скаргі вырак быў зніжаны на 5 гадоў, а за добрую працу яшчэ на 1, 5 гады. Усяго у турме ён прабыў 3,5 гады. Пасля вяртання з турмы спрабаваў Чэслаў Вільчынскі паступіць у Рыжскую Духоўную семінарыю, аднак не атрымў згоды упаўнаважанага на паступленне. У выніку ён рыхтаваўся да святарства прыватна і толькі на працягу кароткага часу меў магчымасць вучыцца у духоўнай семінарыі. Аднак пасля сканчэння семінарыі на працягу сямі гадоў ён не мог атрымаць дазволу ўпаўнаважанага па справах рэлігійных культаў на прэзбітэрскае пасвячэнне. Святарскае пасвячэнне ён атрымаў толькі 17 верасня 1967 г. [24, s. 34–635].

Усе святары Віцебскай вобласці служылі у сваіх парафіях на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. З 1945 г. (з перапынкам, калі ён знаходзіўся на нелегальным становішчы) служыў у Ідолце ксендз Заенц, з 1957 г. служылі у парафіі Міеры ксёндз Ян Грабоўскі, а ў у парафіі Задарожжа ксендз Паўлік, з 1959 г. служыў у парафіі Глыбокае ксендз Францкевіч, з 1961 г. у сваіх парафіях Слабодка і Ваўкалата ксёндз

Гурскі і ксендз Тамковіч, якія былі ўзаемна перанесены у выніку справакаванага канфлікту ў адной з парафій. З 1967 г. служыў у Браславе ксендз Вільчынскі.

На 1 студзеня 1982 г. сярэдні ўзрост каталіцкага духавенства Віцебскай вобласці складаў 68 гадоў. Два святары былі ва ўзросце 69 гадоў, два – 70, па аднаму былі ва ўзросце 72, 73, і 54 гадоў. Зразумела, што немаладым святарам было цяжка працаваць, увогуле здавалася, што пасля іх смерці структуры Касцёла спыняць свае існаванне. Аднак з 1983 года сітуацыя пачала змяняцца.

У 1983 г. упершыню пасля доўгага перапынку, у Віцебскай вобласці распачаў служэнне новы святар, калі у Лынтупскі касцёл, які з 1959 г. не меў сталага святара, быў зарэгістраваны ксёндз Ян Шуткевіч, які скончыў Каунаскую семінарыю.

Тым часам сітуацыя з кадрамі духавенства у 1984-1985 гг. пачала абвастрацца. 10 красавіка 1984 г. памер ксендз Баляслаў Заянц з Ідолты, у тым жа годзе ксендз Казімір Тамковіч з Ваўкалаты [23, л. 31].

У 1985 г. у вобласці не стала яшчэ дзвух святароў. 30 красавіка у вынік інфаркту памер ксёндз Міерскага касцёла Ян Грабоўскі. Ягонае пахаванне адбылося 6 мая. Пакуль труна з целам святара знаходзілася у касцёле, яго наведала звыш 2 тысячы чалавек. У пахаванні прынялі ўдзел 22 каталіцкія святары і 3 праваслаўныя святары, а таксама каля 3 тысячы вернікаў [27, л. 25].

Ксендз Юзаф Францкевіч памер ад раку вантробы 13 мая. У ягоным пахаванні прынялі ўдзел 22 каталіцкіх і 4 праваслаўныя святары і каля 3 тысяч вернікаў, сярод якіх былі жыхары прагранічных раёнаў Літвы і Латвіі [27, л. 36; 28, л. 44].

Два святары памерлі у 1986 годзе. 24 красавіка у выніку другога інфаркту, выкліканага агалцелым цкаваннем святара мясцовымі ўладамі памер ксендз Вільчынскі з Браслава. Мясцовыя ўлады не згадзіліся з пахаваннем ксяндза Вільчынскага побач з касцёлам, але ўначы вернікі таемна выкапалі магілу каля касцёла, дзе і пахавалі святара. 12 снежня памёр ксёндз Станіслаў Гурскі са Слабодкі.

Аднак пакрысе замены спачылым святарам ужо знаходзіліся. З 17 красавіка 1984 г. да снежня 1985 г. у Ваўкалату з душпастырскай паслугай даязджаў ксёндз Эдмунд Даўгіловіч-Навіцкі, выпускнік Каўнаскай семінарыі. З 10 снежня 1985 г. парафіяй апекаваўся ксёндз Францішак Грынкевіч, пробашч з Касцяневіч і Будслава.

У 1985 г. яшчэ тры новыя святары распачалі служэнне ў Віцебскай вобласці. У Глыбокім – ксёндз Уладзіслаў Завальнюк, выпускнік Рыжскай духоўнай семінарыі, які дагэтуль працаваў у Малдове [29, с. 77]. У лістападзе 1985 г. службу ў Мёрах распачаў ксёндз Уладас Пятрайціс, выпускнік Каўнаскай семінарыі, літовец па паходжанні. У 1985 г. службу ў Камаях, дзе дагэтуль не было сталага святара, распачаў ксёндз Ян Шуткевіч, пробашч з парафіі Лынтупы.

У 1986 г. служэнне ў Браславе распачаў ксёндз Генрык Акалатовіч, у Слабодцы – ксёндз Эдвард Ахрамовіч, пляменнік і выхаванец спачылага святара Станіслава Гурскага.

У выніку недахопаў ксяндзоў для здзяйснення абрадаў вернікі часта запрашалі святароў з Літвы і Латвіі. Так, калі у 1981 г. у в. Далекія ўтапіўся хлопчык, на ягонае пахаванне бабуля запрасіла ксяндза з Латвіі, што выклікала вялікую незадаволенасць мясцовых уладаў, бо хлопчык быў сынам брыгадзіра калгаса. У 1984 г. падчас пахавання ксёндз са Швянчоніса у Лынтупах правеў працэсію вернікаў на могілкі [8, л. 98; 23, л. 28].

У тых касцёлах дзе не было святароў, Імша цэлебравалася 4-12 разоў на год. Так, парафія у в. Мосар знаходзілася без сталага душпастыра з 1961 года, з часу смерці пробашча Міхаіла Сухарэвіча. У гэты час шматлікія вернікі ў нядзелі і святы збіраліся ў касцёле, дзе праводзілі набажэнствы без святара. Тыя, хто меў час і магчымасць, дзеля ўдзелу ў Імшы даязджалі ў касцёл у Глыбокае. Адначасова ўвесь гэты час вернікі збіралі грошы на выплату адпаведных падаткаў. Час ад часу ў касцёл прыязджалі святары дзеля цэлебрацыі Імшы і ўдзялення сакрамэнтаў. У прыватнасці, адным з такіх святароў быў ксёндз Францкевіч з Глыбокага.

На 1 ліпеня 1981 г. афіцыйна па сумяшчальніцтве на тэрыторыі Віцебскай воблсці служылі 3 ксяндзоў: ксендз Паўлік і ксендз Францкевіч абслугоўвалі па 2 касцёлы, ксендз Гурскі - 3 касцёлы [30, л. 15; 11, л. 23]. Ксёндз Станіслаў Гурскі са Слабодкі у Камаях па сумяшчальніцтве быў зарэгістраваны з лістапада 1974 г., ксёндз Паўлік у Лынтупах з 1976 г. [31, л. 93].

Аднак на самой справе гэта была толькі пэўная фармальнасць. Ва ўсіх святароў іх душпастырская дзейнасць сягала далёка за межы іх афіцыйных парафій. Так, у касцёл у Задарожжа даязджала вялікая колькасць вернікаў з раней існаваўшых парафій – Чарневічы, Празарокі, Лужкі, Германавічы, Падсвілле, Бабруйшчына, Прошкава, з тым, каб прыступіць да сакрамэнтаў.

Адной з найбольш моцных як на тэрыторыі Беларусі, так і ў Віцебскай вобласці ў пасляваенны перыяд была браслаўская парафія, паколькі касцёл наведвалі вернікі 16 перадваенных парафій, сярод якіх былі Бяльмонты, Плюсы, Опса, Іказнь, Пеліканы, Мяжаны. У вялікія рэлігійныя святы і ўрачыстасці ў браслаўскім касцёле на Імшы знаходзілася да 2500–3000 вернікаў. Пробашч браслаўскай парафіі ксендз Вільчынскі вельмі дбаў аб катэхізацыі дзяцей, якую ў парафіі таемна праводзілі сёстры эўхарысткі. У 1977 г. у браслаўскай парафіі 250 дзяцей урачыста прынялі Першую святую Камунію, что было неча-

каным здарэннем для ўсяго СССР. Яго самаахвярная праца прывяла да ажыўлення рэлігійнага жыцця ў Браславе і ваколіцах. Усё гэта выклікала вострую рэакцыю мясцовых, абласных і рэспубліканскіх улад. Святара пастаянна выклікалі ў абласны і рэспубліканскі Савет па справах рэлігійных культаў, дзе пагражалі яму і шантажавалі. У прэсе рэгулярна друкаваліся артыкулы, у якіх ксяндза Вільчынскага палівалі брудам. Некалькі разоў святара здымалі з рэгістрацыі за "парушэнне савецкага заканадаўства аб культах". Але вернікі вельмі горача баранілі свайго пастыра. Так, у жніўні 1975 г., калі святара ў чарговы раз пазбавілі рэгістрацыі і на верталёце прывезлі ў Віцебск для "разбіральніцтва", мясцовыя калгаснікі-католікі сабраліся ў Браславе і прыгразілі, што калі ксяндзу забароняць служыць, яны спыняць працу на палях у час жніва. У выніку ўлады былі вымушаны вярнуць святару "даведку", якая дазваляла яму служэнне ў браслаўскім касцёле [24, s. 635].

Адначасова атрымаць дазвол на пасупленне у семінарыю юнакам было практычна немагчыма. Аднак у жо у 1980-ыя гг. назіраецца пэўная лібералізацыяу вырашэнні гэтага пытання. Калі у 1980 і 1981 гг. два юнакі з Віцебскай вобласці накіравалі да упаўнаважанага заявы з просьбамі дазволіць ім паступленне у семінарыю, дазвол яны атрымалі, "у мэтах зніжэння вастрыні пытання" [13, л. 27; 15, л. 25].

Нярэдка вернікі бралі ініцыятыву у свае рукі. Так, у 1978 г. ад вернікаў парафіі Камаі паступіла калектыўная заява да упаўнаважанага у справах рэлігій пра Савеце Міністраў па БССР з просьбай аказаць дапамогу у паступленні іх кандыдата у семінарыю у Рыгу ці нават у ПНР. Вернікі з Пастаўскага і Глыбоцкага раёнаў самастойна шукалі святароў на свае парафіі – у Літоўскай ССР і нават у ПНР [32, л. 23].

Ва ўмовах недахопу і адсутнсці святароў вялікую ролю у парафіях пачалі адыгрываць свецкія вернікі, асабліва жанчыны. Асаблівую ролю у падтрыманні веры у парафіі Лучай у пасляваенны час адыграла Ганна Дубовік з в. Круткі. У ейнай хаце вернікі збіраліся на маёвыя. чэрвеньскія і ружанцовыя набажэнсты. Яна перапісвала ад рукі катэхізісы, малітоўнікі і спеўнікі, якіх у тыя часы бракавала. Таксама яна займалася катэхізацыяй дзяцей. рыхтавала іх у групах па 10-12 чалавек, затым везла у касцёл у Гадуцішкі на Літве дзеля Першай Споведзі. У адным са сваіх лістоў яна апісвала, якім чынам гэта адбывалася: у тры гадзіны ўначы трактар падвез яе з дзецьмі на станцыю, даехаўшы, чакалі, пакуль касцёл будзе адчынены [33, с. 62]. Такім чынам Ганна Дубовік прывяла некалькі соцень дзяцей да Першай св. Камуніі.

У выніку у 1983 г. упаўнаважаны Савета у справах рэлігій па Віцебскай вобласці пісаў: "Меркаванне асобных прадстаўнікоў мясцовых органаў улады пра тое, што касцёл хутчэй згасне, калі не будзе ксяндзоў, памылкова: ўзрастае роля так званага апасталату свецкіх" [32, л. 23].

Што тычыцца партрэту тыповага касцёльнага актывіста, то яго можна разгледзець на прыкладзе дадзеных на членаў "дваццаткі", выканаўчых органаў і рэвізійных камісій, якія паходзяць з 1970-х гг.

Як бачна, з дадзеных табліцаў 1, 2 і 3, у большасці гэта людзі пераважна пенсійнага ўзросту, старэйшыя за 60 гадоў, каля чвэрці – гэта рабочыя і калгаснікі. Звяртае ўвагу нізкі адукацыйны ўзровень членаў "дваццаткі", выканаўчых органаў і рэвізійных камісій – практычна ўсе гэта людзі з пачатковай адукацыяй, толькі каля 5 працэнтаў у 1976 і 1977 годзе – гэта людзі, якія мелі сярэднюю адукацыю. Пераважная большасць – гэта мужчыны, жанчын толькі каля адной чацвертай. Пры гэтым звычайна сярод наведвальнікаў касцёла пераважалі жанчыны – іх было каля 70 працэнтаў, мужчын жа каля 30 працэнтаў [37, л. 18].

Паколькі актыўная касцёльная дзейнасць закрывала верніку дарогу да вышэйшай адукацыі і ўвогуле кар'еры, таму, як правіла, адкрыта дэклараваць сваю прывязанасць да веры і Касцёла маглі толькі пенсіянеры, калгаснікі альбо рабочыя.

Вялікую ролю у падтрыманні рэлігійнага жыцця у вобласці адыгралі манахіні Кангрэгацыі Сясцер Служак Езуса у Эўхарыстыі – так званыя эўхарысткі. Вонкава манахіні выглядалі як звычайныя жанчыны, паколькі сваю дзейнасць яны праводзілі таемна. У Віцебскай вобласці у 1970-я – 1980-я гг. яны мелі 4 дамы Кангрэгацыі: у Браславе, Друі, Ідолце і Слабодцы [38, s. 28]. Яны дапамагалі святарам пры парафіях, вялікую ролю адыгрывалі у катэхізацыі дзяцей.

У Браславе пасля выезду выезду настаяцельніцы Ядвігі Віршуты у Караганду, абавязкі настаяцельніцы выконвала с. Рузалія Марцілёнак, якая служыла у браслаўскім касцёле арганісткай і займалася катэхізацыяй дзяцей [38, s. 43]. Паколькі паводле савецкага заканадаўства аб культах да 18-гадовага ўзросту дзеці не мелі права наведваць касцёл і тым больш з імі нельга было праводзіць рэлігійную працу, таму за гэтай дзейнасцю манахінь быў устаноўлены асабліва пільны нагляд. Так, калі выявілася, што сястра Рузалія Марціленак, 12 чэрвеня 1980 г. сабрала каля 50 дзяцей у касцёле для правядзення заняткаў па катэхізісе, яна атрымала строгае папярэджанне. Калі ж мясцовыя улады даведаліся, што ў тым жа месяцы яна сабрала дзяцей у в. Едлавічы, то яе і гаспадара дома выклікалі у райвыканкам, куды быў запрошаны і пракурор. Сястра Рузалія была вымушана даць пісьмовае тлумачэнне сваім дзеянням. Адначасова яе папярэдзілі, што калі падобнае паўтарыцца, яна будзе прыцягнута да крымінальнай адказнасці [8, лл. 95–96; 9, л. 55]. Пасля гэтага сястра Рузалія знаходзілася пад пільным кантролем уладаў. У 1983 г. сястра Рузалія цяжка захварэла і ў 1985 г. памерла. Новай настаяцельніцай у Браславе ў 1984 г. стала сястра Гэлена Кук'ян [38, s. 45].

Табліца 1. – Даныя на членаў "двацаткі", выканаўчых органаў і рэвізійных камісій на 01.01.1975 г. [34, лл. 56, 57].

| | Усяго | У тым ліку | | | | Узрост | | | | Стаж працы | | | | Адукацыя | | | Пол | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | рабочыя | калгас-нікі | Інт. | пенсі-янеры | Да 40 г. | 40-50 | 50-60 | Ст. за 60 г. | Да 2 г. | 2-5 | 5-10 | Больш за 10 | Выш. | Сяр. | Пач. | Муж | Жан. |
| 20 | 209 | 46 | 47 | – | 116 | 9 | 43 | 36 | 121 | 26 | 22 | 77 | 84 | – | 3 | 206 | 155 | 54 |
| Вых. орг. | 33 | 8 | 3 | – | 22 | 1 | 4 | 6 | 22 | 4 | – | 18 | 16 | – | – | 33 | 24 | 9 |
| Рэв. кам. | 32 | 8 | 3 | – | 19 | 1 | 8 | 6 | 17 | 4 | 4 | 19 | 15 | – | – | 32 | 25 | 7 |

Табліца 2. – Даныя на членаў "двацаткі", выканаўчых органаў і рэвізійных камісій на 01.01.1976 г. [35, лл. 50, 51].

| | Усяго | У тым ліку | | | | Узрост | | | | Стаж працы | | | | Адукацыя | | | Пол | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | рабочыя | калгас-нікі | Інт. | пенсі-янеры | Да 40 г. | 40-50 | 50-60 | Ст. за 60 г. | Да 2 г. | 2-5 | 5-10 | Больш за 10 | Выш. | Сяр. | Пач. | Муж | Жан. |
| 20 | 216 | 42 | 44 | – | 130 | 6 | 36 | 36 | 138 | 34 | 16 | 71 | 95 | – | 10 | 206 | 163 | 53 |
| Вых. орг. | 33 | 4 | 4 | – | 25 | 1 | 5 | 6 | 21 | 8 | 1 | 15 | 9 | – | 1 | 32 | 27 | 6 |
| Рэв. кам. | 32 | 6 | 6 | – | 20 | – | 7 | 9 | 16 | 7 | 6 | 9 | 11 | – | – | 32 | 28 | 6 |

Табліца 3. – Даныя на членаў "двацаткі", выканаўчых органаў і рэвізійных камісій на 01.01.1977 г. [36, лл. 39, 40].

| | Усяго | У тым ліку | | | | Узрост | | | | Стаж працы | | | | Адукацыя | | | Пол | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | рабочыя | калгас-нікі | Інт. | пенсія-неры | Да 40 г. | 40-50 | 50-60 | Ст. за 60 г. | Да 2 г. | 2-5 | 5-10 | Больш за 10 | Выш. | Сяр. | Пач. | Муж | Жан. |
| 20 | 212 | 33 | 54 | – | 125 | 6 | 28 | 49 | 129 | 35 | 15 | 79 | 83 | – | 12 | 200 | 156 | 56 |
| Вых. орг. | 33 | 3 | 7 | – | 23 | – | 2 | 9 | 22 | 5 | 5 | 11 | 12 | – | – | 33 | 27 | 6 |
| Рэв. кам. | 33 | 4 | 8 | – | 21 | 1 | 5 | 7 | 20 | 5 | 5 | 11 | 10 | – | – | 33 | 25 | 8 |

Мясцовыя ўлады былі вельмі незадаволеныя тым, што манахіні пражывалі ў Браславе і ксёндз Вільчынскі ўсяляк іх падтрымлівае. У выніку ўпаўнаважаны даў наступную характарыстыку дзейнасці Вільчынскага: "аказаўся фанатыкам і акружыў сябе манаскімі клікушамі з ліку парафіянак" [21, л. 33].

Вялікую ролю у кантролі за рэлігійным жыццём адыгрывалі камісіі садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах. У 1978 г. у Віцебскай вобласці налічвалася 79 такіх камісій, з іх 29 у гарадах і раенах, у якія ўваходзіла звыш 600 чалавек з ліку народных дэпутатаў, работнікаў органаў народнай адукацыі, культуры і аховы здароўя, а таксама адміністрацыйных і фінансавых органаў і другога актыву [6, л. 86]. Перш за ўсе яе прадстаўнікі назіралі за праходжаннем рэлігійных свят. На ўлік бралася колькасць людзей у касцёлах, іх узрост, наяўнасць моладзі, дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту на службах; колькасць асвечаных кулічоў і раздана крэйды. Пасля свята яе прадстаўнікі прысутнічалі пры падліку грошай, якія паступілі пры святкаванні рэлігійных урачыстасцей. Кантралявалі вядзенне касцёльнай дакументацыі – якім чынам вядзецца ўлік абраднасці, ці запісваюцца ў кнігі ўсе даныя, якія вымагаліся заканадаўствам, сачылі, каб пры хрышчэнні дзіцяці мелася згода абодвух бацькоў. У тых умовах гэта часта было немагчыма, паколькі часта маці ахрышчанага дзяцяці была верніцай, а бацька атэістам. Вялікая ўвага надавалася так званай "індывідуальнай працы" з вернікамі.

Рэгулярна дзяжурылі каля касцёлаў падчас рэлігійных святаў камсамольцы. Яны ж праводзілі масавыя народныя гулянні з мэтай адцягнення моладзі ад рэлігіі. Вялікая ўвага надавалася укараненю ў быт новых новых савецкіх абрадаў. Дзеля гэтага распрацоўваліся сцэнарыі абрадаў і рассылаліся ў раёны, праводзіліся агляды-конкурсы на лепшыя грамадзянскія рытуалы. Свой уклад унеслі аўтаклубы. На 1985 г. у Віцебскай вобласці было 366 такіх брыгад. Толькі у Браслаўскім раене брыгадамі аўтаклубу было прачытана 113 лекцый, праведзены 4 вусныя часопісы, 6 тэматычных вечароў, 9 ранішнікаў, 6 вечароў пытанняў і адказаў, 3 дыспуты, арганізавана 19 куткоў атэістаў [28, л. 137].

У 1985 г. у Глыбоцкім РАНА было арганізавана вывучэнне шматдзетных каталіцкіх сем'яў у в. Мосар з мэтай высвятлення іх адносін да заклікаў ксяндзоў аб пераўтварэнні сям'і у "хатні касцёл", "першасную духоўную семінарыю" [28, л. 130].

У 1980–1985 гг. за парушэнне савецкага заканадаўства аб культах даадміністрацыйнай адказнасці у вобласці было прыцягнута 20 чалавек: у 1980 г. – 8, у 1981 – 1, у 1983 – 2, у 1984 - 2, у 1985 – 6 [39, л. 12; 11, л. 30; 40, л. 27; 16, л. 32; 17, л. 33 ].

Дарэчы, звяртае увагу той факт, што ўжо напрыканцы 1970-х- сярэдзіне 1980-х гг. за парушэнне савецкага заканадаўства аб культах ніводны ксёндз у вобласці не быў зняты з рэгістрацыі, што было вельмі распаўсюджана ў 1960-я гг.

Часта моцная атэістычная прапаганда і шматлікія забароны у практыкаванні веры прыводзілі да адыходу людзей ад Касцёла. У 1980 г. каталіцкія ксяндзы казалі: "Цяпер вернікі сталі іншымі, не баяцца ні Бога, ні граху, многія не ходзяць у касцёл, у іх з'явілася абыякавасць да справы выратавання душы".

Самі святары знаходзіліся пад пільным наглядам шматлікіх органаў. З мэтаў выяўлення настрояў ксяндзоў іх казанні рэгулярна праслухоўвліся, асабліва падчас вялікіх рэлігійных святаў. Дзеля гэтага ў камісіях садзейнічання кантролю абавязкова быў чалавек, які валодаў польскай мовай. Затым упаўнаважанаму дакладвалася пра змест казання, асаблівая ўвага звярталася на тое, ці не выказванняў супраць савецкай улады. Самі ўпаўнаважаныя рэгулярна праводзілі гутаркі з ксяндзамі з мэтай выяўлення іх настрояў і адносінаў да тых ці іншых падзеяў. Так, асабліва цікавілі ўпаўнаважаных думкі святароў наконт наконт новай Канстытуцыі 1977 г., абрання Папам Рымскім кардынала з Польшчы, кракаўскага арцыбіскупа Караля Вайтылы, падзей у ПНР у 1980 г, адносна візіта Папы Янам Паўлам II ПНР у 1979 і 1983 гг. [41, л. 40; 21, л. 81; 42, л. 49; 32, л. 45]. Ксяндзы ад гэтых размоваў ухіляліся альбо адказвалі так, каб не паказаць свайго стаўлення да гэтых падзей.

У выніку літургічнай рэформы, праведзенай пасля Другога Ватыканскага сабора, у богаслужэнні пачалі ўводзіцца нацыянальныя мовы. Паколькі большасць вернікаў-католікаў у БССР лічыла сябе палякамі, ды і касцёльныя структуры у краіне знходзіліся пад уплывам Касцёла у ПНР, таму мовай богаслужэнняў замест лацінскай стала польская. Казанні ж заўсёды прамаўляліся на польскай мове. Аднак напрыканцы 1970-х гг. сталі назірацца новыя тэндэнцыі. У 1979 г. на Вялікдзень ксёндз браслаўскага касцёла Чэслаў Вільчынскі ўрывак з Евангелля аб уваскрасенні Хрыста прачытаў па-русску. У 1984 г. на Вялікдзень упершыню ксяндзы Паўлік і Францкевіч казанні прамаўлялі на рускай мове, у тым жа годзе казанне на Нараджэнне Хрыстова ксёндз Даўгіловіч-Навіцкі таксама прамовіў па-руску [21, л. 10; 23, л. 4; 28, л. 4]. Гэтыя тэндэнцыі сведчылі аб тым, што Касцёл прыстасоўваўся да патрэб маладых вернікаў, якія не заўсёды ведалі польскую мову, і, ускосна, што моладзі у касцёлах стала больш.

Нягледзячы на моцную атэістычную прапаганду і шматлікія забароны, з сярэдзіны 1970-х гг. у касцёлах стала павялічвацца колькасць моладзі. Што датычыцца дзяцей, то іх колькасць на службах пастаянна вагалася. Пасля працы камісій садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах з бацькамі, іх колькасць змяншалася, потым праз пэўны час узрастала.

Аб наведванні вернікамі касцёлаў ва ўрачыстасці сведчаць дадзеныя наступныя даныя:

Табліца 4. – Наведванне вернікамі касцёлаў у вялікія рэлігійныя святы [35, лл. 1, 8;. 36, лл. 1, 5; 5, лл. 1, 8; 6, л. 10; 39, лл. 32, 37; 11, лл. 2, 6; 40, лл. 1, 5; 43, лл. 1, 5]

| Год | Раство | Вялікдзень |
|---|---|---|
| 1975 | 7430 | 7390 |
| 1976 | – | 9065 |
| 1977 | 7625 | 7750 |
| 1978 | 5850 | 10080 |
| 1979 | 4370 | 11010 |
| 1980 | 7095 | 8766 |
| 1981 | – | 11555 |
| 1982 | 6270 | 11580 |
| 1983 | 7642 | 12296 |
| 1984 | 7980 | 11599 |
| 1985 | – | 11360 |

Як вынікае з даных, прыведзеных у табліцы 4, паводле афіцыйных дадзеных, колькасць вернікаў у касцёлах у рэлігійныя ўрачыстасці пастаянна ўзрастала. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што, як правіла, гэтыя даныя падаваліся членамі рэвізійных камісій, якія імкнуліся іх занізіць. Напрыклад, звяртае на сябе ўвагу факт невялікай, у параўнанні з іншмі гадамі, колькасці вернікаў на Раство ў 1978 і 1979 гг. – год абрання польскага арцыбіскупа Караля Вайтылы Папам Рымскім і год ягонага першага візіту на радзіму – у Польшчу.

Аб абраднасці ў касцёлах Віцебскай вобласці сведчаць наступныя даныя:

Табліца 5. – Абраднасць [35, л. 68; 36, лл. 31, 57; 5, л. 44;. 6, л. 39; 39, л. 20; 11, лл. 39, 44; 40, лл. 24, 25; 43, лл. 40, 53; 16, л. 30; 17, л. 42]

| Гады | Хрэсьбіны | Адпяванні | | Вянчанні | Вялікодныя споведзі | Канфірмацыі | Споведзі і святыя Камуніі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | завочныя | | | | |
| 1975 | 600 | 306 | 123 | 177 | 17277 | – | – |
| 1976 | 571 | 323 | 119 | 162 | – | – | 94 |
| 1977 | 506 | 231 | 79 | 109 | – | – | 86 |
| 1978 | 432 | 340 | 81 | 154 | 10385 | – | 252 |
| 1979 | 502 | 284 | 183 | 173 | – | – | 308 |
| 1980 | 346 | 289 | 164 | 147 | 21770 | – | 291 |
| 1981 | 425 | 307 | 150 | 171 | 12236 | 42 | 270 |
| 1982 | 384 | 327 | 159 | 154 | 14500 | 26 | 285 |
| 1983 | 454 | 360 | 249 | 133 | 13950 | 7 | 260 |
| 1984 | 352 | 368 | 235 | 91 | 16037 | 21 | 343 |
| 1985 | 306 | 278 | 142 | 73 | 26126 | 108 | 215 |

Аналізуючы даныя табліцы 5, зноў трэба памятаць, што гэта афіцыйная статыстыка Як і ў выпадку наведвальнасці касцёлаў, прадстаўнікі рэвізійных камісій гэтыя дадзеныя імкнуліся зменшыць, не фіксаваць у дакументацыі. Напрыклад, паводле шматлікіх сведчанняў вернікаў Віцебскай вобласці, яны імкнуліся нідзе не фіксаваць факт хрышчэння дзіцяці. Многія вернікі дзяля гэтага хрысцілі дзяцей у хатах, куды патаемна запрашалі святара. Гэта ж датычылася удзяленню дзяцяці Першай Святой Камуніі, ці сакрамэнту шлюбу (вянчання). Хіба найбольш рэальныя дадзеныя – гэта адпяванні, асабліва так званыя “завочныя”, колькасць вялікодных споведзяў і канфірмацыя. Як бачна, колькасць гэтых сакрамэнтаў і сакраменталій пастаянна ўзрастала. Звяртае на ўвагу той факт, што толькі пасля доўгага перапынку, з 1981 г. касцёлах Віцебскай вобласці пачынае ўдзяляцца сакрамэнт канфірмацыі. Гэты сакрамэнт мае права ўдзяляць толькі біскуп. У выніку на працягу доўгага перыяду у пасляваенны час моладзь атрымоўвала яго у касцёлах Літвы і Латвіі, дзе меліся каталіцкія біскупы. У 1966 г. у некалькіх касцёлах Віцебскай вобласці з дазволу біскупаў канфірмацыю ўдзялялі святары, аднак упаўнаважаны забараніў яго ўдзяленне, паколькі прымалі гэты сакрамэнт асобы, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту. З 1981 г. сакрамэнт канфірмацыі у касцёлах Віцебскай вобласці стаў ўдзяляцца толькі асобам, якія дасягнулі 18 гадоў.

Аб актыўнай падтрымцы Касцёла з боку вернікаў сведчаць грашовыя паступленні, памеры якіх, як бачна па даных табліцы 6, пастаянна ўзрасталі.

Табліца 6. – Грашовыя паступленні (у тыс. руб.) [45, л. 29; 36, л. 32; 5, л. 45; 6, л. 40; 39, л. 5; 11, л. 27; 40, л. 20; 43, л. 28; 44. л. 31].

| Гады | Паступіла ўсяго грошай | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | Ад абрадаў | Ад дабраахвотных ахвяраванняў |
| 1975 | 40,8 | 9,6 | 31,0 |
| 1976 | 47,5 | 9,5 | 38,0 |
| 1977 | 48,6 | 9,6 | 39,0 |
| 1978 | 47,2 | 8,4 | 38,8 |
| 1979 | 54,0 | 8,6 | 45,4 |
| 1980 | 46,4 | 7,9 | 38,1 |
| 1981 | 51,5 | 8,8 | 42,0 |
| 1982 | 47,6 | 10,5 | 38,4 |
| 1983 | 57,0 | 9,2 | 45,5 |
| 1984 | 51,0 | 9,5 | 42,2 |

**Заключэнне.** У сярэдзіне 1980-х гг. у Віцебскай вобласці мелася 11 касцёлаў, у якіх служыла 7 святароў. Толькі адзін святар ужо быў у сталым узросце, служачы на тэрыторыі Віцебскай вобласці яшчэ з ваенных часоў. Іншыя 6 святароў былі ва ўзросце да 40 гадоў і толькі параўнальна нядаўна скончылі духоўныя семінарыі.

Усе касцёлы ў Віцебскай вобласці знаходзіліся ў яе заходняй частцы. Аднак у некаторых мясцовасцях усходняй часткі вобласці вернікі збіраліся на малітвы без святароў і прасілі ва ўладаў дазволу на адкрыццё касцёлаў у гэтым рэгіёне. Пры гэтым і вернікі заходняй часткі вобласці актыўна змагаліся за адкрыццё касцёлаў у іх мясцовасцях.

Ва ўмовах недахопу святароў узрастала роля апостальства свецкіх вернікаў, якія ўсё больш актыўна служылі у сваіх супольнасцях. З канца 1970-х гг. назіраецца новая з'ява, калі святары пачынаюць выкарыстоўваць падчас служб рускую мову.

Увогуле, нягледзячы на моцную атэістычную прапаганду, напрыканцы 1970-х – сяр. 1980-х гг. уціск на Касцёл з боку ўлады стаў меншым, а сам Касцёл здолеў захаваць свае пазіцыі ў гэтым рэгіёне.

ЛІТАРАТУРА

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. // Рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн., 1994. – Т. 2.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ) – Ф.1439. Воп. 2. Спр. 22, Л. 97
3. Dzeje parafii i miasteczka Duniłowicze na Kresach Wschodnich na przestrzeni wieków (XV–XX) // Nasz kraj. – 2009. – № 34-35. – S. 3 – 40.
4. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 38. Л. 122.
5. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 41, Л. 39.
6. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 45. Л. 51.
7. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 43. Л. 46–47.
8. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 57. Л. 93.
9. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 61. Л. 14-15.
10. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 51. Л. 19.
11. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 56. Л. 24.
12. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 58. Л. 39.
13. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 62. Л. 27.
14. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 63. Л. 38.
15. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр.69. Л. 30.
16. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 68. Л. 37.
17. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 72. Л. 37.
18. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 42. Л. 6.
19. Інтэрв'ю з Фаінай Бізуновай, жнівень 2017 г., в. Мікалаева.
20. Julian Siedlecki. Losy Polaków w ZSRR w latach 1939–1986. Gdansk, Oficyna Wydawnicza «Graf», 1990.
21. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 50. Л. 24.
22. Інтэрв'ю з Станіславай Семераковай, май 2002 г., г. Віцебск.
23. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 70. Л. 31.
24. Roman Dzwonkowski SAC. Leksykon duchowieństwa polskiego represionowanego w ZSRS 1939–1988. Lublin. Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego 2003.

25. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 115. Л. 58, 95-96.
26. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 112. Л. 11-14, 17-19.
27. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 73. Л. 25.
28. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 74. Л. 44.
29. Гарбінскі, Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя. / Ю. Гарбінскі. – Мінск–Мюнхен : "Беларускі кнігазбор", 1999.
30. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 26. Л. 15.
31. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 120. Л. 93.
32. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 65. Л. 23.
33. Жарнасек, І. Дарога апостальства / І. Жарнасек // Nasz kraj. – 2010. – № 36–37. – S. 59–62
34. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 29. Л. 56, 57.
35. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 33. Л. 50,51.
36. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр 37. Л. 39, 40.
37. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр 34. Л. 18.
38. S. Halina Strzelecka SJE. Służebnice Jezusa w Eucharystii na terenach Związku Radzieckiego w latach 1945–1991. – Warszawa. 1994.
39. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 53. Л. 12.
40. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 60. Л. 27.
41. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 47. Л. 40.
42. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 54. Л. 49.
43. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 64. Л. 1,5.
44. ДАВВ – Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 68. Л. 31.

*Паступіў 18.06.2019*

## ROMAN CATHOLIC CHURCH IN THE VICIEBSK DIOCESE IN THE LATE 1970s AND THE MIDDLE 1980s: ON THE EVE OF THE CARDINAL CHANGES

***K.V. LAURYNENKA***

*The article discusses the state of the Roman Catholic Church on the territory of the Viciebsk Diocese in the second half of the 1970s and the first half of the 1980s, i. e. on the eve of the cardinal changes. Lay faithful also gained a larger role in religious life during the lack of priests. The nuns of the Congregation of the Servant Sisters of Jesus in Eucharist were providing much help in the parishes. The were several new tendencies in the activities of the Church during this period, for example, some priests used the Russian language in the preaching instead of Polish.*

***Keywords:*** *priest, church, parish, representative for religious affairs, catechization.*